ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № 15 (877) | Аўторак, 11 кастрычніка 1994г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

У апошні чацвер верасня адбылося першае ў гэтым навучальным годзе пасяджэнне вучонага савета ГДУ. Аб некаторых выніках яго работы ў 1993-94 годзе і святкаванні 25-годдзя універсітэта зрабіў даклад рэктар член-карэспандэнт АНБ Л.А.Шамяткоў (матэрыял у ізлажэнні чытайце на 2-й стар.).

Аб выніках уступных экзаменаў ва універсітэт і задачах па арганізацыі новага набору далажыў вучонаму савету адказны сакратар прыёмнай камісіі Д.Р.Лін.

Па інфармацыі вучонага сакратара Л.Я.Палякова зацверджаны план пасяджэнняў вучонага савета на бягучы навучальны год.

На першы семестр гэтага навучальнага года зацверджаны імянныя стыпендыяты.

Разгледжаны кадравыя пытанні. Па конкурсу на вакантную пасаду загадчыка кафедры матэматычнага аналізу абраны дацэнт А.С.Ус. Загадчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту старшы выкладчык І.Р.Трафімовіч рэкамендаваны Атэстацыйнай калегіі Мінадукацыі Беларусі да прысваення яму вучонага звання дацэнт.

Вучоны савет прыняў хадайніцтва аб прысваенні дырэктару студэнцкага клуба, мастацкаму кіраўніку народнага фальклорна-харэаграфічнага ансамбля "Радзімічы" А.В.Лысянкову ганаровага звання "Заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь".

На вучоным савеце разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

29 верасня на пасяджэнні вучонага савета універсітэта прынята рашэнне аб назначэнні імянных стыпендый

*ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ:*

**БАБЫНА Іне** - студэнтцы 5 курса эканамічнага факультэта;

**КРЭШЧЫК Людміле** - студэнтцы 4 курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.

*ІМЯ О.ШМІДТА:*

**РУСАКОВУ Сяргею** - студэнту 4 курса матэматычнага факультэта;

**КАЗЛОВУ Уладзіславу, ~~МІШЫНУ Генадзю~~, ГАПАНОВІЧУ Мікалаю** -студэнтам 3 курса матэматычнага факультэта.

*ІМЯ Я.КУПАЛЫ:*

**СУРЫНОВІЧ Вікторы** - студэнтцы 4 курса філалагічнага факультэта;

*ІМЯ Ф.І.ФЁДАРАВА:*

**САВЕНКУ Дзмітрыю, УТКІНУ Дзмітрыю** - студэнтам 5 курса фізічнага факультэта.

## ЗАМЕЖНЫЯ ГОСЦІ

Па запрашэнню рэктарата ў нашым універсітэце знаходзіцца выкладчык англійскай мовы з шатландскага горада-пабраціма Абердзіна Том Колінз. ён прыехаў да нас за ўласныя сродкі і на добрачыннай аснове праводзіць семінарскія заняткі і выступае з лекцыямі перад студэнтамі і выкладчыкамі кафедры англійскай мовы. Госць з паўночнай краіны прабудзе ў ГДУ да канца кастрычніка.

◆ ◆ ◆

Нярэдкімі госцямі ў нас сталі вучоныя з Кітая. На гэты раз прыбыла дэлегацыя з педагагічнага універсітэта г.Яньчжоу. У яе ўваходзілі першы прарэктар названай навучальнай установы Жанг Шуаёнг, намеснік дэкана матэматычнага факультэта Чэнг Хуаліанг, сакратар партарганізацыі Ванг Ях, прафесар Го Вэньбінь, які абараніў дысертацыю доктара навук пад навуковым кіраўніцтвам прафесара Л.А.Шамяткова.

Кітайскія калегі прывезлі ў наш універсітэт групу студэнтаў для вывучэння рускай мовы. Яны будуць набываць неабходныя веды на працягу ад трох да пяці гадоў - у залежнасці ад ступені: бакалаўра або магістра.

Дэлегацыя вучоных Кітая мела сустрэчу ў рэктарацe, азнаёмілася з пастаноўкай навучальнага і навуковага працэсу ў ГДУ, для гасцей была арганізавана шырокая культурная праграма.

## СУСТРЭЧА З РОДНАЙ ШКОЛАЙ

У жыцці калектыву гомельскай школы №28 напярэдадні Дня настаўніка адбылася знамянальная падзея -- адзначаўся 50-гадовы юбілей школы. 1-га кастрычніка тут сустрэліся многія яе выпускнікі. 40 гадоў таму атэстат сталасці гэтай школы атрымаў рэктар нашага універсітэта, цяпер доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў. У розныя гады яе закончылі таксама іншыя выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ.

Урачыстасць з нагоды залатога юбілею праходзіла ў выключна кранальнай атмасферы. Было выказана шмат цёплых, шчырых слоў былым педагогам. З вялікім хваляваннем выхаванцы школы дзяліліся ўспамінамі аб далёкім мінулым, расказвалі адзін другому аб сённяшняй працы і жыцці.

На ўрачыстай сустрэчы пранікнёна прагучалі ўдзячныя словы педагагічнаму калектыву Л.А.Шамяткова. Ён уручыў юбілярам прывітальны адрас ад яе выпускнікоў.

## ВІНШУЕМ !

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, калектыў кафедры эканамічных тэорый горача віншуюць асістэнта названай кафедры **МІНЧАНКА Вольгу Аляксандраўну** (навуковы кіраўнік -- прафесар М.В.Навучыцель) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

• 1 Разгледжана на вучоным савеце. Навіны двух тыдняў.
• 2 З даклада рэктара універсітэта.
• 3-4 Выпрабуйце сябе ў конкурсе. Калі ласка, на міжнародны фестываль.
• 5 Арыенціры па вывучэнню гісторыі Беларусі.
• 6-7 Археалагічная практыка.
• 8 Незвычайная выстава. Праявіце шчодрасць.

# НОВЫ ЭТАП НАШАЙ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ

## /з даклада рэктара Л.А.Шамяткова на вучоным савеце/

Фундамент новаму навучальнаму году закладваўся ў папярэднім навучальным годзе. Ён быў характэрны тым, што жыццё шматтысячнага калектыву студэнтаў, выкладчыкаў, і супрацоўнікаў праходзіла ў атмасферы падрыхтоўкі і святкавання 25-годдзя ўтварэння нашага універсітэта.

Я не буду шмат засяроджваць ўвагу на тых здабытках калектыву за прайшоўшыя чвэрць стагоддзя і, у прыватнасці, за мінулы навучальны год. Аб гэтым даволі падрабязна гаварыў у святочным дакладзе. Зазначу толькі, што паспяхова ажыццёўлены выпуск высокакваліфікаваных спецыялістаў. Сёлета набраны даволі моцны кантынгент першакурснікаў.

Святкаванне юбілею паказала, што аўтарытэт нашага універсітэта значна ўзрос. Аб гэтым сведчаць унушальныя дэлегацыі, якія прыехалі нас вітаць са знамянальнай падзеяй. Як вы памятаеце, да нас на ўрачыстасці прыбылі прадстаўнікі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў, Міністэрства адукацыі, Гомельскага аблвыканкома, мясцовых улад, вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый краіны.

Як у рэспубліцы ў цэлым, так і ў нас сітуацыя па прыёму першакурснікаў склалася амаль аднолькавая. Колькасць першакурснікаў, што навучаюцца за бюджэтны кошт, засталася прыкладна на ўзроўні мінулага года. Нам давялося ў межах кантрольных лічбаў прыняць на шэраг спецыяльнасцей першакурснікаў за кошт прадпрыемстваў і арганізацый. Сёлета прымаліся студэнты і за асабістыя сродкі грамадзян. У сувязі з цяжкім фінансавым становішчам нашай краіны гэта тэндэнцыя будзе павялічвацца. Таму сістэмай стане рэгуляванне ўнутранай структуры прыёму, пераразмеркаванне кантрольных лічбаў у межах універсітэта паміж спецыяльнасцямі і спецыялізацыямі з улікам перспектыўных прагнозаў развіцця эканомікі і сацыяльна-культурнага комплексу нашага рэгёна, вынікаў працаўладкавання выпускнікоў, наяўнасці дагавораў на падрыхтоўку спецыялістаў.

Як вядома, у апошнія гады намі практыкавалася сумяшчэнне выпускных экзаменаў з уступнымі. Гэта ў пэўнай ступені ставіла абітурыентаў у няроўныя ўмовы. Таму Міністэрства адукацыі і навукі ў будучым плануе ўкараненне прынцыпу дзяржаўна-грамадскай ацэнкі і рэгуляванне якасці адбору абітурыентаў пры дапамозе грамадскіх камісій па арганізацыі і правядзенню прыёму на аснове палажэння Міністэрства ад 5 ліпеня гэтага года.

Ёсць пэўныя цяжкасці з размеркаваннем маладых спецыялістаў, асабліва па спецыяльнасцях вытворчага цыкла. Таму дэканатам, кафедрам трэба больш плённа дзейнічаць у заключэнні дагавораў з адпаведнымі службамі. Варта таксама выкарыстоўваць замежны вопыт сувязей паміж прадпрыемствамі, у тым ліку праз арганізацыю і правядзенне "кірмашоў кар"еры", іншых мерапрыемстваў, устаноў, якія запланаваны Міністэрствам пры падтрымцы Фонду Сораса.

У бягучым навучальным годзе будуць пашыраны рэфармацыйныя працэсы ў вышэйшай адукацыі. Так, загадам міністра за нумарам 183 ад 17 чэрвеня зацверджаны новы пералік спецыяльнасцей, а таксама вызначаны пералік спецыялізацый і кваліфікацый. Базавымі ВНУ, у тым ліку і нашым універсітэтам завяршаецца дапрацоўка новых вучэбных планаў. Дарэчы, нашы планы эканамічнага цыкла прызнаны ўзорнымі і прыняты як асноўныя для многіх ВНУ Беларусі.

Нам неабходна шмат папрацаваць і па пераходу да шматузроўневай сістэмы навучання. Міністэрствам распрацавана адпаведнае палажэнне і ў бліжэйшы час мы павінны атрымаць адпаведны дадатак, у якім будуць канкрэтна выкладзены палажэнні аб магістратуры і атэстацыі студэнтаў ва ўмовах шматузроўневасці навучання. Безумоўна, пераход да шматузроўневай сістэмы згодна з рашэннем Міністэрства будзе ажыццяўляцца паступова. Першымі да яе пачнуць пераходзіць ВНУ універсітэцкага тыпу. Адметная рыса такіх універсітэтаў - высокі ўзровень агульнанавуковай, у тым ліку гуманітарнай падрыхтоўкі. Варта зазначыць, што гуманітарны кампанент павінен быць гібкім і прадугледжваць варыятыўныя падыходы з улікам профілю ВНУ і патрэб студэнтаў.

Цяжка сёння распрацоўваць стандарты і новы змест адукацыі, метадычнае і інфармацыйнае забеспячэнне без супрацоўніцтва з краінамі СНД, блізкага і далёкага замежжа. Камандзіроўкі, стажыроўкі, перападрыхтоўка выкладчыкаў павінны быць абавязковымі, але вырашаць гэтыя праблемы надзвычай складана. У гэтым плане ў нас ёсць напрацоўкі з замежнымі краінамі. Толькі восем праектаў з Беларусі атрымалі фінансаванне праекта "ТЭМПУС-2", але, на жаль, туды трапілі ў асноўным сталічныя ВНУ. Нам жа застаецца быць больш настойлівымі ў гэтым напрамку.

Сёння Міністэрства адукацыі і навукі заклапочана станам навуковай, тэхналагічнай і інавацыйнай сфер дзейнасці ВНУ. Сітуацыя без перабольшвання крызісная: адбываецца вычарпанне раней створаных навуковых зачынаў, адыход найбольш кваліфікаваных спецыялістаў у іншыя сферы дзейнасці, спыненне прытоку ў аспірантуру. Словам, ствараецца пагроза зніжэння агульнага ўзроўню работ з-за адсутнасці сродкаў на набыццё сучасных прылад, абсталявання, матэрыялаў, інфармацыйная ізаляцыя ад сусветнай навукі. Таму варта ўзмацніць экспертызу НДР і іх вынікаў, у тым ліку за кошт стварэння ведамаснай экспертнай сістэмы, фарміравання ведамасных праграм. Нам неабходна шырэй выкарыстоўваць магчымасці фонду фундаментальных даследаванняў, Фонду Сораса, выходзіць на міжнародныя арганізацыі, ствараць кантралюемыя камерцыйныя структуры, прываблівацъ цікавых і перспектыўных заказчыкаў.

Для станаўлення вышэйшай школы нацыянальнага характару як па зместу, так і па форме трэба вызначыць мову навучання і развіцця навукі. Неабходна прыкласці максімум намаганняў, каб на педагагічных патоках у гэтым навучальным годзе ажыццявіць якаснае беларускамоўнае выкладанне на першых курсах.

Міністэрства патрабуе, каб рэктары ВНУ прынялі дзейсныя меры па далейшаму пашырэнню сферы ўжывання дзяржаўнай мовы перш за ўсё кіруючым складам, у навучальным працэсе, падрыхтаванасці выпускнікоў да выкладання прадметаў на роднай мове, распрацоўцы методыкі інтэнсіўнага навучання мове.

У лісце міністра В.І.Стражава "Аб некаторых пытаннях дзейнасці ВНУ ў 1994-95 навучальным годзе" асабліва падкрэсліваецца тое, што маёмасць ВНУ знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, замацоўваецца на правах валодання, карыстання і распараджэння згодна адпаведным дакументам. Міністэрства разлічвае, што ў цяжкі для краіны час мы прыкладзем намаганні, каб паспяхова вырашыць складаныя задачы па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.



Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны члену-карэспандэнту АН РБ Л.А.ШАМЯТКОВУ

Паважаны
Леанід Аляксандравіч!

Асацыяцыя садзейнічання ААН у Рэспубліцы Беларусь, улічваючы высокі навуковы і творчы патэнцыял студэнтаў Вашага універсітэта, запрашае іх прыняць удзел у студэнцкім конкурсе эсэ "Маё пасланне ААН", прысвечаным 50-годдзю Арганізацыі Аб"яднаных Нацый.

Будзем удзячны Вам за дапамогу і падтрымку ў правядзенні гэтага конкурсу.

**З павагай прэзідэнт, член Нацыянальнага Камітэта па святкаванню 50-годдзя ААН В.І.ІВАНОЎ.**

## СТУДЭНЦКІ КОНКУРС

Асацыяцыя садзейнічання ААН у Рэспубліцы Беларусь аб'яўляе студэнцкі конкурс па эсэ "Маё пасланне ААН", якое прысвячаецца 50-годдзю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Конкурс з'яўляецца сумесным праектам па адукацыі моладзі АС ААН у Рэспубліцы Беларусь і Сусветнай федэрацыі асацыяцый садзейнічання ААН.

Права на ўдзел у конкурсе маюць студэнты ВНУ ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў.

Аб'ём эсэ: прыкладна 130-150 друкаваных радкоў /10-20 хвілін/.

Мова: беларуская, руская.

Тэрмін падачы эсэ - да 10 снежня 1994 года па адрасу: 220050, г.Мінск, вул. Інтэрнацыянальная 24А, АС ААН з паметкай "Журы конкурсу".

Тры лепшыя работы будуць адзначаны АС ААН у Рэспубліцы Беларусь на спецыяльнай урачыстай цырымоніі, прысвечанай гэтай падзеі.

Эсэ першага прызёра разам з яго кароткай біяграфіяй, даведкай з ВНУ і копіяй пасведчання аб нараджэнні будзе адпраўлена ў Жэневу для далейшага ўдзелу ў Міжнародным конкурсе.

Першы прызёр Міжнароднага конкурсу будзе заахвочаны паездкай у Нью-Йорк для ўдзелу ў Памятнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, прысвечанай 50-й гадавіне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Студэнту, які зойме другое месца ў Міжнародным конкурсе, будзе выдадзена стыпендыя ў памеры 1000 даляраў ЗША для аплаты за адукацыю.

Трэці прызёр атрымае датацыю ў памеры 500 даляраў ЗША для набыцця неабходнай літаратуры.

Усім пераможцам Рэспубліканскага і Міжнароднага конкурсаў будзе ўручаны міжнародны сертыфікат Сусветнай федэрацыі АС ААН.

АНОНС

# МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ МОЛАДЗІ "АРТ-СЕСІЯ"

## пройдзе ў нашым універсітэце з 1 па 7 лістапада

Гэта падзея па сваёй значнасці больш чым незвычайная. Фестываль такога вялікага маштабу - першы ў культурным жыцці вышэйшых навучальных устаноў Гомельшчыны. Мэта яго правядзення - актывізацыя і развіццё творчых здольнасцей моладзі, прапаганда беларускага нацыянальнага мастацтва, знаёмства з маладзёжнымі творчымі калектывамі іншых краін, наладжванне з імі культурных і сяброўскіх сувязей. У Гомель прыедуць шматлікія замежныя госці - каля 100 студэнтаў з Індыі, Шатландыі, Францыі, Даніі, Аўстрыі, Польшчы. Назва фестывалю "Арт--сесія" гаворыць сама за сябе: art-мастацтва, і гэтае мерапрыемства стане своеасаблівым аглядам творчых здольнасцей студэнцкай моладзі розных нацыянальнасцей.

Пры падтрымцы рэктарата ГДУ, прафкома студэнтаў, спонсараў аргкамітэтам праведзена вялікая падрыхтоўчая работа, каб фестываль на працягу ўсіх сямі дзён праходзіў арганізавана, згодна шырокай праграме. А яна абяцае шмат цікавых сустрэч, знаёмстваў, конкурсаў, экскурсій, у якіх прымуць удзел не толькі госці і арганізатары фестывалю, але і студэнты вышэйшых навучальных устаноў г.Гомеля.

Кожны дзень "Арт--сесіі" будзе непаўторным, непадобным адзін на другі. Асабліва карыснай і цікавай абяцае стаць сустрэча ўдзельнікаў фестывалю са студэнтамі ўсіх ВНУ горада, якая адбудзецца ў сераду 2-га лістапада. Дэлегацыі раз"едуцца па навучальных установах, дзе будуць абмяркоўваць справы і праблемы беларускай і замежнай моладзі.

У праграму фестывалю ўключаны юбілейны вечар, прысвечаны 25-годдзю народнага фальклорна-харэаграфічнага ансамбля "Радзімічы". Адбудзецца ўшанаванне гэтага вядомага не толькі ў вобласці і рэспубліцы, але і ў далёкім замежжы калектыву. Артысты пакажуць сваё высокае майстэрства, якое шліфавалася на працягу ўсіх гадоў існавання ансамбля. Можна сказаць, што ідэя правядзення маючага адбыцца фестывалю належыць менавіта "Радзімічам". Калі паўстала пытанне аб святкаванні іх знамянальнай юбілейнай даты, удзельнікі калектыву вырашылі запрасіць гасцей з тых замежных краін, дзе ім, а таксама іншым творчым калектывам ГДУ давялося выступаць з канцэртамі - з французскага Клермон-Ферана, з шатландскага Абердзіна. Паслалі запрашэнні і ў іншыя замежныя краіны, з якімі наш універсітэт падтрымлівае сяброўскія сувязі. Так і "нарадзіўся" фестываль "Арт-сесія", які набыў статус міжнароднага.

Пашанцавала сёлета студэнтам І курса, якія рыхтуюцца да традыцыйнага універсітэцкага агляду-конкурсу талентаў "Ану, першакурснік!" Ён увайшоў у



фестывальны тыдзень і адбудзецца ў нядзелю, 6 лістапада. Іх выступленні ўбачаць і замежныя госці, што, безумоўна, надасць пачынаючым талентам большую адказнасць і шмат хваляванняў.

"Изюминкой" па задумцы членаў аргкамітэта абяцае быць запланаваная на 2 лістапада шоу-праграма "Сладкоежка" з конкурсам на найбольш смачны арыгінальны, прыгожа аформлены кулінарны твор (аб ёй больш падрабязна чытайце на 4-й стар.).

Заключны дзень, 7 лістапада, збярэ ўсіх на гала-канцэрт фестывалю, дзе будуць прадстаўлены самыя лепшыя нумары з канцэртных праграм. І, канешне, іх выканаўцы не застануцца без падарункаў і сувеніраў.

Ёсць падставы спадзявацца на тое, што фестываль стане сапраўдным святам студэнцтва, незалежна ад таго, якія мовы будуць на ім гучаць. Бо моладзь з'яднае зразумелае ва ўсім свеце слова "Дружба".

Фестываль чакае вас. Білеты на яго можна набыць у п.І-8 вучэбнага корпуса № І.

**Т.ДУБЯК.**

**УВАГА, УВАГА !!!**

# ЦІ ЁСЦЬ У ВАС ФАНТАЗІЯ ?

Гэта вырашылі праверыць члены аргкамітэта фестывалю "Арт-сесія", і таму ў яго разнастайную праграму ўключылі своеасаблівы "смачны" конкурс на лепшае прыгатаванне кандытарскіх вырабаў, усемагчымых дамашніх прысмак: джэмаў, варэння, фруктовых налівак, вінаў і г.д., у каго на што хапае неабходных для гэтага кампанентаў і, зразумела, фантазіі. Падрабязна пра гэты конкурс расказвае рэжысёр культурнага цэнтра універсітэта Г.Варонін:

- Усе мы ведаем адзін аднаго па сумеснай рабоце, вучобе, а ў кожнага чалавека ёсць яшчэ свае схільнасці, захапленні, якім аддаецца вольны час, энергія душы. Думаецца, што нямала сярод іх заўзятых кулінараў, здольных і ў гэты цяжкі ў матэрыяльным плане час здзівіць сваіх дамашніх, гасцей незвычайнай стравай. На гэта мы і разлічваем.

Запрашаем выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў паказаць свае здольнасці ў кулінарыі. Другога лістапада ў фае актавай залы чакаем усіх, хто прыгатуе дома нейкі незвычайны кулінарны твор, прыгожа аформіць яго і ўмела прадставіць. Журы конкурсу, у якое ўвойдуць прадстаўнікі рэктарата, прафкомаў, сталовай універсітэта, замежныя госці фестывалю, культурнага цэнтра ГДУ, пасля дэгустацыі вынясуць свой прысуд: якому з іх аддаць гран-пры конкурсу, заахвочвальныя прызы.

Спадзяемся ўбачыць сярод удзельнікаў конкурсу і нашых мужчын, бо іншы раз яны могуць здзіўляць сваёй кулінарнай фантазіяй нават самых заўзятых гурманаў. Мы прапаноўваем наступныя намінацыі вырабаў, у кожнай з якой будуць вызначаны лепшыя: тарты; піроҗныя; пячэнне; варэнне і джэмы:; фруктовыя кактэйлі; экзатычная страва; дамашнія віны, настойкі; пірагі і булачкі.

Мы задумвалі гэта мерапрыемства не проста як конкурс, а па-сапраўднаму вясёлую шоу-праграму з удзелам скамарохаў. Так што прыходзьце, не пашкадуеце. Заяўкі на ўдзел у конкурсе падаваць да 25 кастрычніка ў п.1-7а, 1-8 вучэбнага корпуса № 1,

тэл. 57-33-30, 57-11-17.

*Агульнауніверсітэцкі конкурс "Ану, першакурснік!" 1994 года праводзіцца 6 лістапада 1994 года з 15.00 у актавай зале ГДУ. ~~Сёлета~~ конкурс уключаны ў праграму I Міжнароднага фестывалю моладзі "Арт-сесія". Білеты на мерапрыемства будуць распаўсюджвацца праз культоргаў факультэтаў.*

*Тэл. для даведак: 57-33-30, ~~аўд. 1-8 вуч.~~ корп. № 1.*



## ПАЛАЖЭННЕ

### аб правядзенні агульнауніверсітэцкага конкурсу "Ану, першакурснік!" 1994-95 навучальнага года.

Штогод у ГДУ праводзіцца агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці з мэтай развіцця творчай ініцыятывы, культурнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў.

Адным з этапаў агляду з"яўляецца конкурс сярод студэнтаў I-га курса "Ану, першакурснік!".

У конкурсе прымаюць удзел толькі студэнты I-га курса. Дапускаецца акампанемент з боку, а таксама ўдзел не першакурснікаў у парных выступленнях для цэласнасці і мастацкага ўзроўню нумара.

Працягласць выступленняў не больш 40 мінут /з іх 5 - кантрольных/.

Час на падрыхтоўку перад выступленнем - 5 мінут.

Конкурсныя праграмы павінны быць прадстаўлены для паказу 20 кастрычніка і 27 кастрычніка зацверджаны для ўдзелу.

Да 27 кастрычніка павінны быць прадстаўлены аддрукаваныя праграмы ў колькасці 10 экземпляраў.

Калектывам прапануецца выбар тэмы і жанру. Праграма павінна быць змястоўнай, цікавай і разгорнутай па тэматыцы.

Праграма ацэньваецца па 15-бальнай сістэме.

Парадак выступленняў будзе вызначаны пасля 27-га кастрычніка і аб'яўлены дадаткова.

Журы адзначае лепшую аўтарскую работу, лепшых вядучых, выканаўчае майстэрства.

Вынікі конкурсу і ўзнагароджанне прызамі лаўрэатаў з уручэннем пераходзячага прыза падводзяцца пасля заканчэння конкурсу ў той жа дзень.

Праграмы ацэньвае журы ў саставе:

**Лысянкоў А.В.** - дырэктар студэнцкага клуба;

**Шырынкіна М.Б.** - мастацкі кіраўнік;

**Казлоў М.А.** - кіраўнік народнай харавой капэлы "Дзянніца";

~~**Ушакоў У.В.**~~ - кіраўнік народнага тэатра "Люстэрка";

**Варонін Г.І.** - кіраўнік беларускага тэатра;

**Эбзеева А.М.** - кіраўнік фальклорнай групы;

прадстаўнік рэктарата ГДУ;

прадстаўнік прафкома студэнтаў ГДУ.

Палажэнне аб конкурсе прынята мастацкім саветам студэнцкага клуба ГДУ 20 верасня 1994 года.

## МАЛАДЗЁЖНЫ ЦЭНТР - ДА ВАШЫХ ПАСЛУГ

У 1994-95 навучальным годзе маладзёжны цэнтр як падраздзяленне студэнцкага клуба ГДУ імя Ф.Скарыны прапануе новы від паслуг у правядзенні мерапрыемстваў па арганізацыі вольнага часу студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага саставу: з 13 кастрычніка ў памяшканні студэнцкага кафэ кожны чацвер і пятніцу праводзіць тэматычныя вечары для студэнтаў, супрацоўнікаў, выкладчыкаў універсітэта.

Прымаюцца папярэднія заказы на правядзенне вечароў, агеньчыкаў, вяселляў і іншых урачыстасцей.

За даведкамі звяртацца па адрасу: вул. Савецкая, 108, к. №1, п.1-8, 1-7а.
Тэл. 57-33-30,
57-11-17,
56-64-26.

**МАЛАДЗЁЖНЫ ЦЭНТР ГДУ імя Ф.СКАРЫНЫ.**



# ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ЗАНЯТКАЎ ПА КУРСУ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ"

**(Працяг. Пачатак у №14)**

**_СЕМІНАР 9._ БЕЛАРУСЬ У КАНЦЫ XVIII-ПЕРШ.ПАЛ. XIX ст.ст.**

1. Палітыка царызму на далучаных землях Беларусі. Змены ў эканоміцы.
2. Беларусь у вайне 1812 г.
3. Грамадска-палітычны рух у перш. пал. XIX ст. Паўстанне 1830--1831 г.г.

**ЛІТАРАТУРА:**

Нарысы гісторыі Беларусі. ч.I,II. Мн. 1994г. (Да ўсіх заняткаў).

Ульяшэвіч М. Расійская палітыка на землях былога Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панаваннем Кацярыны II і Паўла I (1772 -- 1801 гг.) -- Мн.: Адраджэнне, 1992 г.

Лютых А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII -- первой пол. XIX вв. Мн. 1987 г.

Лютых А.М., Туміловіч Г.М. Дваранства Беларусі ў перыяд 1 крызісу феадалізму (канец XVIII ст.-перш. пал. XIX ст.). -- Мн. 1991 г.

Сцяпунёк І.Р. "Па ўсяміласцівейшаму найвысачайшаму ўказу" (Аб палітыцы імператрыцы Кацярыны II на Беларусі). "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта". Сер.4. - 1987г. N2.- С.72-73.

Ф.Энгельс. Дебаты по польскому вопросу во Франкфурте. // К.Маркс и Ф.Энгельс. - Соч. - 2-ое изд. - Т.5.-С.352-353.

Ф.Энгельс. Какое дело рабочему классу до Польши? // К.Маркс , Ф.Энгельс. -Соч. - 2-ое изд. - Т.16.-С.163-166.

Ф.Энгельс. Внешняя политика русского царизма. // К.Маркс, Ф.Энгельс. - Соч. - 2-ое изд. -Т.22 - С.18-19; 23-31.

Корнейчик Е. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г. - Мн.:Госиздат БССР, 1962 г.

Мазинч Г., Ерусалимчык А. Березина. 1812 г. - Мн.: Беларусь. 1991г.

Нестерчук Л.М. Отечественная война на Брестчине. - Брест. 1990 г.

Яроменка К. Пра вайну 1812 года. // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. - 1987 г. - Мн.: С.20-21.

Загорульская О. Проведение реформы Киселёва в Белоруссии (40-е гг. XIX в.) // Вестник Белгосуниверситета. Сер. 3 - 1987 г. - №1 С.23-26.

Шавель А. Нерэалізаваныя магчымасці. (У 160-ю гадавіну паўстання 1831 г.) // Крыніца (Родник) 1991 г. - №2. С.36-37.

Пичуков В.П., Сычев В.И. Политика царизма на Беларуси в первой половине XIX в. Гомель, 1994г.

**_СЕМІНАР 10._ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.**

1. Нацыянальна-культурная палітыка царызму і яго мерапрыемствы па русіфікацыі Беларусі.
2. Мастацкая літаратура.
3. Развіццё мастацтва. Тэатр.

**ЛІТАРАТУРА:**

Гісторыя беларускага мастацтва. Т.3. - Мн.: 1969 г. - С.12-63.

Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. - Т.2.- Мн.: 1969 г. - С.1-126.

Лубянецкі Э. Беларусы? Асадзі назад! (Палітыка русіфікацыі ў XIX ст.). //Чырвоная змена. - 1990 г. - 1 лістапада.

Пичуков В.П., Сычев В.И. Политика царизма на Беларуси в первой половине XIX в. Гомель, 1994 г.

**_СЕМІНАР 11._ РЭФОРМА 1861 Г. АДМЕНА ПРЫГОННАГА ПРАВА**

1. Прычыны рэформы 1861 г.
2. Падрыхтоўка і правядзенне рэформы 1861 г. на Беларусі і яе асаблівасці.
3. Рэформы 60-70-х гг.
4. Паўстанне 1863 г. К.Каліноўскі і яго рэвалюцыйная дзейнасць. "Мужыцкая праўда".

**ЛІТАРАТУРА:**

Панютич В. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861--1900 гг. - Мн.: Наука и техника. 1990 г.

Самбук С. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. - Мн.: 1990 г.

Улащик Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. - Мн.: 1965 г. Наука.

Шыбека З. Ад рэформы да рэвалюцыі. (Аб зямельнай рэформе 1861 г. і становішчы ў Беларусі). Голас Радзімы. - 1991 г. 18 ліпеня.

Хрестоматия по истории Белоруссии с древнейших времен до 1917 г. - Мн.: Изд.БГУ.1977 г. -- С.268-280, 292-298, 299-303.

Калиновский К. Из печатного и рукописного наследия. - Мн.: Беларусь. 1988 г.

Кісялёў Г.В. На пераломе дзвюх эпох: паўстанне 1863 г. на Міншчыне. - Мн.: Полымя. 1990 г.

Шалькевич В. Кастусь Калиновский: страницы биографии. Мн.: Университетское. 1988 г.

**_СЕМІНАР 12._ РАЗВІЦЦЁ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ АДНОСІН НА БЕЛАРУСІ Ў 60-90 -х гг. XIX СТ.**

1. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы.
2. Прамысловае развіццё Беларусі ў 60-90-х гг. XIX ст.
3. Развіццё транспарту, гандлю і гарадоў.

**ЛІТАРАТУРА:**

Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. Мн. 1982 г.

Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (вторая половина XIX в.). Мн. 1971 г.

Бейлькин Х.Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1861-1914 гг. Мн. 1989 г.

Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860-1920 гг. Мн. 1973 г.

**_СЕМІНАР 13._ ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ І КУЛЬТУРА Ў ПАРЭФОРМЕННЫ ПЕРЫЯД.**

1. Грамадска-палітычны рух. Група "Томан".
2. Умовы ўтварэння беларускай нацыі і яе асаблівасці.
3. Палітыка царызму ў галіне школьнай справы.
4. Развіццё культуры. Ф.Багушэвіч, А.Гурыновіч, Я. Лучына і іншыя.

**ЛІТАРАТУРА:**

Хрестоматия по истории Белоруссии. Мн. 1977. С.422-425.

Этнаграфія беларусаў: гісторыяграфія, этнагенэз, этнічная гісторыя. Мн.1992 г.

История белорусской дооктябрьской литературы. Мн. 1977 г.

Карнейчык Я.І. Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс. Мн.1969г.

Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі на Беларусі. Мн. 1968 г.

Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии. Мн. 1977 г.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6-ці тамах. Т.I. Мн., 1993. (Да ўсіх заняткаў).

**(Працяг будзе).**

# АРХЕАЛАГІЧНЫ ПОШУК ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Студэнцкая практыка -- гэта заўсёды цікава. Але ж асабліва цікава, калі яна археалагічная. Традыцыя працы нашых гісторыкаў-першакурснікаў у сапраўдных археалагічных экспедыцыях /універсітэцкіх, абласнога музея, Акадэміі навук/ мае ўжо даўнюю гісторыю. Дзе толькі не працавалі студэнты універсітэта! Яны дапамагалі вывучаць стаянкі першабытных людзей на Веткаўшчыне і ў наваколлях Чачэрска, пад кіраўніцтвам выкладчыка В.І.Сычова вялі раскопкі гарадзішча "Шведская Гара" ў Гомелі. Былі і шматгадовыя "курганныя" экспедыцыі разам з выкладчыкам У.У.Багамольнікавым /першым загадчыкам універсітэцкага Археалагічнага музея/ у Жлобінскім і Чачэрскім раёнах, дзе побач з вёскамі Курганне і Нісімкавічы вывучаліся радзіміцкія пахаванні X-XII ст.ст. Шмат уражанняў пакінулі выязды на гарадзішчы Пруднікі ў Віцебскую вобласць /у атрад Інстытута гісторыі АН на чале з В.І.Шадырам/ і Уваравіцкае на Буда-Кашалёўшчыну /у атрад абласнога музея на чале з А.І.Драбушэўскім/. Нашы студэнты першымі трымалі ў руках надзвычай рэдкія археалагічныя знаходкі, даследавалі іх у сваіх курсавых і дыпломных работах. А колькі сапраўдных адкрыццяў зрабілі беларускія вучоныя пры непасрэдным удзеле гомельскіх студэнтаў...

Яшчэ дзесяць гадоў таму наш старажытны горад учэпіста ахоўваў загадкі сваёй шматвяковай гісторыі, якія "ляжаць" у культурных напластаваннях у парку імя Луначарскага і суседніх вуліц.

Ужо першыя вялікія раскопкі, распачатыя абласным музеем пры дапамозе ГДУ ў 1986-87 гг., прынеслі сапраўды здзіўляючыя адкрыцці. У зоне рэканструкцыі кінатэатра імя Ісачанкі былі знойдзены рэшткі сярэдневяковага Гомія /летапіснай папярэдніцы Гомеля/, сабрана значная калекцыя рэчаў матэрыяльнай культуры YI-XYIII ст.ст. Менавіта тады паўстала пытанне пра тое, што Гомель - адзін са старажытнейшых гарадоў усходніх славян, гісторыя якога пачынаецца шмат раней 1142 г. У наступныя гады нашы студэнты вывучалі фартыфікацыі Гомельскага замка каля будынка музея, сярэдневяковы пасад у раёне сучаснай вул. Пралетарскай.

Раскопкі ў Гомелі праводзяцца там, дзе помнікам старажытнасці пагражае знішчэнне будаўніцтвам. Археолагі спяшаюцца туды, дзе робяцца катлаваны будучых дамоў, трасы камунікацый. Вось і ў гэтым годзе археалагічны атрад універсітэта накіраваўся на сядзібу Петрапаўлаўскага сабора зусім не выпадкова: тут планавалася новабудоўля царквы-хрысцільні. Аснову экспедыцыі склалі дзве групы былых першакурснікаў ГА-11 /староста А.Гарбачоў/ і ГН-11 /староста Р.Банькоўскі/. Працаваць давялося ў экстрэмальных умовах, пад промнямі бязлітаснага сонца. Трыццаціградусная спякота гнала бестурботных гараджан на пляжы, а тут - рыдлёўкі, тачкі і бяскрайнія горы цьмяна-шэрай зямлі, тоны якой былі вынесены з раскопа плошчай каля 200 квадратных метраў. Уся цяжкая праца трымалася на моцных душой і целам юнаках, сярод якіх вылучаліся А.Цакуноў, Д.Жданаў, А.Чабан, К.Уласаў, Д.Шкудун, С.Малошык, Ю.Камароў, Я.Макаранка, В.Сілівончык, А.Даронька.

Першая археалагічная знаходка --расійская манета 1738 г. - была выяўлена самай назіральнай удзельніцай раскопак І.Бярозкінай. Аўтарамі іншых цікавых знаходак, сярод якіх былі гліняныя курыцельныя люлькі XYII-XYIII ст.ст., фрагмент аклада ад іконы, сярэдневяковая касцяная ёмістасць для спецый, манеты, нацельны крыжык, шкляныя пацеркі і бранзалеты XII-XIY ст.ст., керамічныя і каменныя прасліцы, сталі Н.Саўчанка, А.Буракевіч, І.Палянок, С.Фаўхіева, С.Баравікоў, Ж.Захарава, Т.Шарманава і іншыя. Дзяўчаты пераглядалі і размінaлі рукамі культурны пласт. А.Жалудова, Л.Корж, Т.Кандрацэнка, А.Максіменка, К.Собаль, Т.Зязюліна, Т.Раева выбралі з зямлі тысячы фрагментаў сярэдневяковых ганчарных і шкляных сасудаў, кафляў з мудрагелістым арнаментам, касцей жывёл /якія яшчэ раскажуць вучоным пра старажытную жывёлагадоўлю і ежу гаміян/. Л.Козінцава асвоіла даволі складаную справу - зачыстку культурнага пласта /выраўноўванне стажыстай паверхні рыдлёўкай з мэтай выяўлення рэштак сярэдневяковых пабудоў/.

Важнейшае адкрыццё палявога сезона 1994 г. - знаходка часткі найстаражытнейшага Гомельскага паселішча, якое існавала на сожскіх кручах яшчэ ў YI-YIII ст.ст. Студэнты даследавалі рэшткі пабудовы, дзе працаваў майстар-металург. Ён апрацоўваў і чорны, і каляровы метал, верагодна, рабіў жалезныя прылады і адліваў бронзавыя ўпрыгожванні. Археалагічныя матэрыялы даюць поўныя падставы разглядаць гэтае паселішча ў якасці першага ў доўгім ланцугу працэсу ўзнікнення нашага горада. У старажытнейшых летапісах такія славянскія цэнтры другой паловы І тыс. н.э. завуцца "градамі". "Прота-Гомій" быў месцам канцэнтрацыі адміністрацыйнай улады, адкуль мясцовая знаць кіравала прылягаючай акругай.

Пасля 984 г. радзіміцкі Гомій быў далучаны да дзяржавы вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча, а з сярэдзіны XI ст. яго лёс быў цесна звязаны з Чарнігаўскім княствам. XII ст.датуюцца даследаваныя намі рэшткі жылля, у якіх самы юны дабраахвотны памочнік экспедыцыі, навучэнец СШ № 32 Я.Малікаў адшукаў кавалкі прыгожых шкляных бранзалетаў і каменных пацерак, прывезеных 800 гадоў таму з Сярэдняй Азіі.

З XII па XYIII ст. гэты ўчастак Гомеля ўваходзіў у склад уласна горада /навакольнага града, места/, які меў лінію фартэцый па перыметру Кіеўскага спуску, Гаміюка /Кагальнага рва/ і сучаснай вул. Працоўнай. Ужо ў часы Кіеўскай Русі ў Гомелі былі вуліцы, на якіх размяшчаліся дамы гараджан, рамесныя майстэрні, царкоўныя сядзібы. У 1989 г. археолагі знайшлі на месцы Гомельскага замка, каля цяперашняга будынка музея, старажытны будаўнічы матэрыял - цэглу-плінфу, якая сведчыць пра наяўнасць у замку каменнай царквы XII ст. Такія ж знаходкі напаткалі экспедыцыю і ў гэтым годзе. Ёсць меркаванне, што яны адносяцца да больш старажытнага папярэдніка царквы Раждзества Багародзіцы /па дакументах XYII-XYIII ст.ст. вядома, што яна размяшчалася побач з сучасным Петрапаўлаўскім саборам/. Такім чынам, ужо ў XII-XIII ст.ст. у Гомелі магло існаваць некалькі помнікаў манументальнай культавай архітэктуры.

Самыя багатыя знаходкі чакалі пры даследаванні культурных адкладанняў перыяду Вялікага княства Літоўскага /XIY-XYIII ст.ст./. XIY-XY ст.ст. датуюцца рэшткі касцярэзнай майстэрні, дзе з ласінага рогу рэзалі разнастайныя вырабы. Унікальная рэч - рагавая накладка на лук, якая дазваляе меркаваць пра канструкцыю гэтай старажытнай зброі. Значнай падзеяй было вывучэнне глыбокага сутарэння XYI-XYII ст.ст., якое было выкапана ў свой час пад вялікай зрубнай хатай. Калісьці ў ёй стаяла цудоўная кафляная печ; пасля разбурэння пабудовы яе рэшткі ссунуліся ў сутарэнне. Сярод сабраных тут разнастайных рэчаў ёсць незвычайныя - бронзавыя кубак і падсвечнік, якія належаць да культавага начыння. Таму мы мяркуем, што ў гэтай хаце жыў святар, магчыма, той самай Багародзіцкай царквы.

Даследаваная частка места загінула ў жудасныя гады аблог і штурмаў Гомеля пад час казацкіх паходаў, антышляхецкіх паўстанняў і баявых дзеянняў сярэдзіны XYII ст. паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай. Кожны метр гэтай зямлі паліты крывёй мірных і ратных людзей.

Вялікая колькасць і значнасць археалагічных знаходак замарудзілі нашы палявыя даследаванні. Тэрмін практыкі скончыўся, а працы яшчэ заставалася нямала. Аднак знайшліся добраахвотнікі, якія не пашкадавалі свайго вольнага часу. Яшчэ два тыдні працавалі (і як працавалі !) на раскопе практыканты Р.Кабашнікаў, А.Гуцаў, Д.Рабцаў, А.Белякоў, Ю.Карнілаў, А.Курдзесаў, Р.Сізоненка, А.Сальнікава. Да іх далучыліся старшакурснікі В.Новікаў, Н.Лазько, А.Туравец, Т.Зайцава, І.Саўчанка, А.Кавалёва, студэнты геолага--геаграфічнага факультэта А.Серакоў, А.Пуканаў, былыя абітурыенты, а зараз гісторыкі-першакурснікі С.Жыхараў і А.Замойскі, мастак і краязнаўца А.Скідан. Арганізаваць працу энтузіястаў дапамог дэканат гісторыка-юрыдычнага факультэта і выкладчык кафедры гісторыі Беларусі В.І.Сычоў. Працу археалагічнай экспедыцыі асвятлялі абласныя і рэспубліканскія сродкі масавай інфармацыі.

Удзельнікі раскопак набылі трывалыя веды ў галіне гістарычнага краязнаўства і археалогіі, якія, безумоўна, карысныя для іх прафесійнай падрыхтоўкі. Палявы сезон паспяхова скончыўся, аднак карпатлівая праца над знаходкамі, якія трапілі ў Археалагічны музей кафедры ўсеагульнай гісторыі, працягваецца. Зараз распачынаецца падрыхтоўка археалагічных калекцый для новай экспазіцыі, прысвечанай гісторыі матэрыяльнай культуры Гомеля. У студэнтаў-гісторыкаў ёсць магчымасць працягваць тэарэтычныя і практычныя навуковыя распрацоўкі, якія можна рэалізаваць у курсавых і дыпломных работах па гісторыі нашага краю.

**А.МАКУШНІКАЎ,**
канд. гіст.навук, асістэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі, кіраўнік практыкі.

**ВЫСТАВЫ**

## "ЗЯЛЁНЫ ДОМ" ЗАПРАШАЕ

Нядаўна ў выставачнай зале Саюза мастакоў праходзіла незвычайная выстава, якая прыцягнула да сябе ўвагу не толькі гарадской багемы і інтэлігенцыі, але і шырокіх мас. Незвычайная яна тым, што сабрала пад адным дахам працы самых розных мастацкіх жанраў і стыляў: пейзажы, партрэты, абстрактныя кампазіцыі, камянёвыя і драўляныя скульптуры, прыгожыя рэчы з абпаленых дошак і ржавага жалеза і нават падобныя на аўтамабіль збудаванні, сабраныя са старых тэхнічных дэталяў. І ўсё ж каля 60 прадстаўленых твораў мастацтва мелі і агульнае. Усе яны былі створаны ў час мастацкага пленэра, які праходзіў летам у зоне адпачынку "Чонкі".

Тэрмін "пленэр" прыйшоў да нас у 19 стагоддзі з французскага мястэчка Барбізон і першапачаткова абазначаў жывапіс на адкрытым паветры. У далейшым пленэрам сталі называць усякую тусоўку мастакоў, якія не толькі маюць зносіны паміж сабой, але і працуюць. Арганізатарам і спонсарам акцыі, падобнай якой у Беларусі не праводзілася даўным-даўно, выступіла гомельская фірма "Зялёны дом". Гаспадыня "Зялёнага дома" Ларыса Габдрахманава не толькі гандлюе электрычным кабелем праз уласную фірму, але і трымае аднайменную галерэю, якая знаходзіцца ў будынку ДК Беларускага таварыства глухіх / вул. Юбілейная, 48 / . Па афішах, якія хутка мяняюцца ў горадзе, можна падумаць, што залы "Зялёнага дома" не прастойваюць без новых экспазіцый.

У пленэры таксама непасрэдна ўдзельнічалі:"дзядуля беларускага авангарда" В.Ф.Чарнабрысаў, мастачка О.Сазыкіна, якая выстаўлялася ў бліжнім і далёкім замежжы, удзельнікі гомельскага аб'яднання мастакоў "Стальная турэцкая гвардыя" - Д.Чак, Д.Кавалёў, Д.Калінін, а таксама В.Лук'янаў з Масквы, А.Сыцько з Гродна, А.Кірэль з Мінска, мастак-педагог таварыства глухіх В.Сідарэнка і інш. Дырэктар ДК Беларускага таварыства глухіх Анатоль Нікіцін зняў дакументальны фільм аб мастаках. Наведвальнікі выставы побач з працамі мастакоў мелі магчымасць убачыць творы самых аўтараў: яны як жывыя глядзелі з партрэтаў масквіча Віктара Лук"янава. Даваць яшчэ нейкую інфармацыю аб выставе, думаю, не трэба - такія рэчы лепш бачыць сваімі вачыма.

"Жыццё ў Гомелі, дзякуючы "Зялёнаму дому", становіцца больш цікавым", - пісала ў адным з нумароў газета "Знамя юности". І з гэтым цяжка не згадзіцца.

**В.БОРТНІК,**
студэнт 4 курса філалагічнага факультэта.

Многія чытачы нашай газеты ды ўладальнікі чэкаў "маёмасць" цікавяцца, як іх можна выкарыстаць, не пацярпеўшы страт. Думаецца, што ніжэй змешчаная публікацыя дапаможа знайсці адказ на існуючыя пытанні.

**АДКРЫТАЕ АКЦЫЯНЕРНАЕ ТАВАРЫСТВА "СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ ФОНД, ЯКІ АКУМУЛЮЕ ІМЯННЫЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЙНЫЯ ЧЭКІ "МАЁМАСЦЬ", ЗАПРАШАЕ ВАС СТАЦЬ АКЦЫЯНЕРАМІ ФОНДУ ААТ СІФ "ГЕНЕРАЛЬНЫ", ШТО ЗНАХОДЗІЦЦА ПА АДРАСУ:**
г.Гомель, вул. Савецкая, 87, п.226

Памер устаўнога фонду -- 5 000 000 руб.

Прадметам дзейнасці таварыства з'яўляецца прыцягненне грашовых сродкаў грамадзян і юрыдычных асоб, а таксама імянных прыватызацыйных чэкаў з мэтай інвесціравання сродкаў у каштоўныя паперы іншых эмітэнтаў, а таксама ўкладання іх у банкі. Таварыства выпускае простыя акцыі ў колькасці 2000 штук у выглядзе запісу на рахунках намінальнага кошту 2500 рублёў. Фонд забяспечвае страхаванне ўсіх акцый.

Продаж акцый пачынаецца з дня апублікавання дадзенай кароткай інфармацыі, заверанай Дзяржінспекцыяй па каштоўных паперах.

Памер дывідэндаў вызначаецца агульным сходам акцыянераў і выплачваецца штогод.

З праспектам эмісіі можна азнаёміцца ў бухгалтэрыі таварыства штодзённа, акрамя выхадных, з 9 да 17 гадзін па адрасу:

г.Гомель, вул. Савецкая,87, п.226.

## ДЗЕНЬ ДОНАРА

пройдзе ва універсітэце 14 кастрычніка. Наш медпункт будзе чакаць тых, хто не зможа прайсці міма заклiку прыняць удзел у гэтым сапраўды дабрачынным мерапрыемстве. Донарам можа стаць любы здаровы чалавек ад 18 да 60 гадоў. Супрацьпаказаннем да ўдзелу ў донарстве служаць вострыя і хранічныя захворванні. Жадаючага стаць донарам абследуюць урачы, менавіта яны рашаюць, ці трэба браць кроў з гэтага чалавека і ў якой дозе.

Кроў любой групы выкарыстоўваецца пры пераліванні і пры перапрацоўцы на прэпараты.

Даць кроў - выратаваць жыццё! Праблемы донарства заўсёды вырашаюцца, зыходзячы з галоўнага прынцыпу - максімум карысці хвораму і ніякай шкоды донару. Абсталяванне, сістэмы для ўзяцця крыві - стэрыльныя. Іголкі абаронены ўпакоўкай, прызначаны для аднаразовага карыстання і знішчаюцца пасля ўзяцця крыві ў донара.

Работнікі станцыі пералівання крыві, медпункта універсітэта спадзяюцца, што наш заклік знойдзе водгук. Донарам неабходна пры сабе мець пашпарт.

Чакаем вас у медпункце універсітэта 14 кастрычніка з 10 да 15 гадзін.

**В.ПАДДУБНАЯ,**
фельчар медпункта ГДУ.



*Осень светлая,осень тихая, как несбывшаяся мечта,*
*на кленовые листья сбитые стелет спящие небеса*

## АДКРЫЎСЯ ЦЫРКАВЫ СЕЗОН

праграмай у двух аддзяленнях "Цырк Расіі" з удзелам вялікага ілюзійнага нумара заслужанай артысткі Расіі Ларыты Магамедавай, дрэсіраваных сабачак пад кіраўніцтвам Алы Угрыновіч і іншых. Увесь вечар на манежы папулярныя клоуны - Іван Фёдараў і Максім Макоўскі.

Касы цырка працуюць з 10 да 20 гадзін.

Даведкі па тэл. 55-13-53.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта фізічнай культуры і спорту, кафедра лячэбнай фізічнай культуры выказваюць спачуванне дацэнту **КАРТАШОВАЙ** Ні Васільеўне з выпадку напаткаўшага яе гора - смерці **МУЖА**.

Калектыў геолага--геаграфічнага факультэта, савет ветэранаў вайны і працы смуткуюць з выпадку смерці дацэнта, пенсіянера **КАРТАШОВА** Віталя Піліпавіча і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

Калектыў кафедры педагогікі і псіхалогіі, савет ветэранаў вайны і працы смуткуюць з выпадку смерці кандыдата псіхалагічных навук, дацэнта, пенсіянеркі **КАМІСАРЧЫК** Клары Абрамаўны і выказваюць спачуванне яе родным і блізкім.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў факультэта прафарыентацыі і падрыхтоўкі да вучобы ў ВНУ выказваюць глыбокае спачуванне асістэнту **АЎДОНІНАЙ** Тацяне Віктараўне з выпадку напаткаўшага яе гора - смерці **МАЦІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк. Тыраж 1.500 экз. Заказ 570

Падпісана да друку 07.10.94.